**Валянціна Шэўчык**

## …Дзеля чаго варта жыць і пакутаваць…

*Каб соль не страціла*
*Уласцівую ёй солкасць,*
*А песня – гукаў,*
*Трапяткіх і кволых,*
*Вясёлка—колераў,*
*Каханне—шчырасці,*
*А чалавек—душы сваёй,*
*Вялікай, несмяротнай,*--
*На свеце існуе мастацтва…*
Сяргей Дзяргай

Калі ўпершыню свядома адчула вялікую прыцягальнасць гэтых узнёслых слоў? Хутчэй за ўсё, калі вяла зацікаўленую размову пра Майстра – Разьбяра па дрэве Люцыяна Таполю… Успаміны сягаюць далей. Згадваюцца студэнцкія гады. Лекцыі па фальклоры. І голас выкладчыка:

Дробненькі  дожджык хай накрапае.
Выйдзі, дзяўчына, сэрца чакае.
Выйдзі, дзяўчына, не бойся марозу:
Я ж тваіх ручак не замарожу.
Я ж тваіх ручак не замарожу,
Я ж твае ручанькі ў шапачку ўложу.

Так, гэта ён, наш незабыўны выкладчык, народны паэт Беларусі Ніл Сямёнавіч Гілевіч спяваў для сваіх студэнтаў. Не бяруся сцвярджаць, ці можна гэта назваць мастацтвам. Але гэта было так прыгожа! Не проста запісаць некалькі сшыткаў народных песень ад вясковых бабуль, не толькі ўмець іх класіфікафаць, а сэрцам адчуць іх прыгажосць і непаўторнасць. Так данесці і запаланіць сэрцы, запаліць у іх агеньчык любові да роднага слова, да народнай песні мог толькі Майстар!

Параўнальна нядаўна з’явіўся ў школьнай праграме твор, у якім хвалююча падаецца лёс Мастака, хараства, гармоніі, прыгажосці.

З самага пачатку апавяданне бярэ ў палон, прымушае па-іншаму біцца сэрца: “Кожную пасудзіну паасобку ён рабіў натхнёна ад пачатку да канца. Майструючы, ён не думаў ні аб чым іншым, як аб сваёй рабоце. Забываў аб ядзе, сне”. Адчуваю, згаджаюся, пераконваюся, што радасць жыцця героя ў радасці творчасці: “Трэба так працаваць, каб рук і плеч не чуць, каб сэрца млела, каб пот цурком ліўся”. Хто ж ён, хто

“сумняваецца, разважае, нюхае жалеза, прыцмоквае губамі, патрабуе, каб інструмент блішчаў і пераліваўся ў розныя колеры, як люстэрка, як празрыстая вада…, хіліцца над інструментамі, нібы хоча іх пацалаваць…” Герой майго аповеду – бондар Даніла з аднайменнага апавядання Змітрака Бядулі. “Калі ён майструе, дрэвы на гародзе не шумяць і птушкі не пяюць”.

Даніла, вядома, вопытны майстар, а “вопыт набываецца доўгімі гадамі, рупнасцю, трываласцю і замілаваннем да сваёй працы”.

Чытаю і дзіўлюся, зайздрошчу, стараюся данесці да вучняў, як герой бачыў мастацкім вокам старога майстра ў нямых кавалках дрэва гаварлівыя, пявучыя, вабныя сваёй зграбнасцю і грацыяй начоўкі, вядзёркі і лыжкі.

Даніла гарэў на сваім уласным агні… “ Гэта былі не вёдры, не начоўкі, не лыжкі, а дзіўны сон пекных форм. Гэта былі ажыццёўленыя мары Данілавага сэрца. Гэта было тое, дзеля чаго варта жыць і пакутаваць…”

Перачытваю і ўсведамляю: як жа здорава, калі твае пакуты падзяляе блізкі табе чалавек. Аўдоцця, жонка Данілы, “наскрозь была пранята майстэрствам Данілы. Як адгалосак, як цень свайго мужа, яна жыла яго жыццём, радавалася яго радасцямі, гаравала яго горам… Ён быў як бы сонцам, а яна – планетай, якая кружылася вакол сонца”. Сваю Аўдоццю ён лічыў разумніцай, толькі ёй можна было глядзець, як ён майструе. Хрысціянскае веравызнанне павучае нас, што муж і жонка ў радасці і ў горы ўсё дзеляць папалам. Ці не таму так зразумелы “слёзы, буйныя, гарачыя” Аўдоцці, калі яны вярнуліся ад пані. Яна нікому не жаліцца, моўчкі пераносіць голад і холад…

Лаўлю сябе на думцы, як няпроста захапіць сучасных маладых людзей парывамі душы вялікага майстра. І раптам з апошняй парты: “ Блін! Як у майго дзеда ў стальмашні. Аж стружкамі запахла”. А ў мяне ў душы радасць: прарвала, зачапіла!

Для каго ж стараўся-майстраваў Даніла? Хто мог ацаніць яго талент? Каму разьбяр па дрэве мог перадаць гэты божы дар? Неадназначнымі былі меркаванні вучняў. Як жа дрыжыць голас дзяўчыны, калі яна цытуе: “…радасць бондара вырасла да таго, ажно дух захоплівала. Сэрца стукала так моцна, што Даніла сам пужацца пачаў. На валаску паміж жыццём і смерцю знаходзіцца тое, за што ты ўвесь свой век гараваў… Зараз пачую прысуд пані. Яна правільна ацэніць… Яна надзене на яго чало вянок славы”.

Зноў юнак з апошняй парты: “Знайшоў, каму давяраць. Яна ж яму ў душу плюнула, “зрабіла такую рану, якая ніколі не загоіцца. Яго скінулі з гары ў глыбокую яму”. Нават “не глянула на пекную работу”. Думала, што грошы – усё”.

Не абышлося без дыскусіі наконт таго, ці зразумеюць людзі Данілу. У апраўданне даводзілі, што Даніла як майстар хоча, каб яго разумелі, а суседзей лічыў “нічога нявартымі, неразумнымі, ён глядзеў на іх звышку”. Лічу: слушна было заўважана, што і зараз не любяць тых, хто глядзіць на нас зверху. Падтрымалі майстра ў жаданні выказаць вяскоўцам, “як трэба кемна вастрыць начынні-інструменты, як трэба выбіраць дрэва на клёпкі, на дны, на начоўкі…”

І, як бальзам на сэрца, думка аб тым, калі ў працы чалавек адчувае “нязмерную радасць і шчырае шчасце, калі яго рукі робяць адну пекнату”. Спрэчным аказаўся погляд Данілы на тое, што “мэтай жыцця былі не заработкі, а праца сама па сабе, той любімы час працы, які дае праўдзівае шчасце майстру”.

Падводжу да думкі аўтара, што Даніла, умеючы працаваць, не ўмеў гэтак жа гаварыць, што “ўсё прыгожае відаць у прастаце і шчырасці”, а непадобнасць героя да іншых людзей робіць яго адзінокім. Прашу паразважаць над словамі суседзяў: “Калі б каго-колечы з нашых Даніла навучыў, той добрым словам успамінаў бы, як бацьку роднага шанаваў”.

Добрым напамінкам падлеткам было заданне ўбачыць у творы, што “сонца засумавала” разам з Данілам. “Поле шапацела аб вялікім Данілавым горы…” Шкада, што старшакласнікі не сказалі самі, якой метафарай Мастак слова перадаў душэўныя пакуты Майстра-бондара.Так, “памерлі мары, якімі ён цешыўся ўсё жыццё…” Варта нагадаць, што адмоўнае часам больш прыкметнае, чым станоўчае. Людзі прывыклі бачыць у Даніле таленавітага майстра, яго справы ўспрымаліся як нешта абавязковае. І толькі тады ўспамінаюць, калі яго не хапае або зусім не стае. Бондарства ён закінуў. “Інструменты паржавелі, бо ў хаце ён рэдка калі бываў—валяўся цэлымі днямі п’яны ў карчме пад сталом…” Па тым, як узляцела некалькі рук угору, разумею: ёсць яшчэ жаданне выказацца, а значыць, лёс Творцы-самародка зацікавіў вучняў. Прашу падзяліцца меркаваннямі ў пісьмовай форме, паразважаць, ці актуальна гэта тэма сёння.

…Празвінеў званок. Ці ўсё атрымалася? Што ўпушчана? Які плён, якія вынікі працы? Чамусьці зноў згадала Ніла Сямёнавіча, на ўспамін прыйшлі яго словы: “ Не забывайце, куды прыйшлі (у Храм) і дзеля чаго (дзеля святой справы)”. Вось ужо 46 гадоў кожную раніцу я ўзыходжу на ганак Малагарадзячыцкай школы – рабіць “святую справу”. Мяняецца час, мяняюцца прыярытэты, мяняюцца вучні.

І ўсё-такі, усё-такі…

У пісьмовым выказванні юнак з апошняй парты стараўся мяне пераканаць, што талент не павінен прапасці, яго трэба перадаваць маладым – у працы, спорце, “хто на што здольны. Шкада, што бондар

Даніла яго нікому не перадаў…” Таму хочацца верыць, што зярняты, якія сее настаўнік, пападаюць на ўдзячную глебу, з якой узыходзяць парасткі дабрыні, спагады, прыгажосці.